

Алег Грушэцкі

# Рыцар Янка і каралеўна Мілана.

## Агонь і лёд

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2023

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Г91

Мастак
*Віктар Іосіфавіч Козел*

**Грушэцкі, А. Л.**
Г91 Рыцар Янка і каралеўна Мілана. Агонь і лёд / Алег Грушэцкі. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2023. — 272 с. : іл.
ISBN 978-985-581-632-5.

Янка і Мілана прыязджаюць на зімовыя вакацыі ў дзедаву вёску. Снежныя забавы, калядаванне да глыбокай ночы… Але найбольш клічуць да сябе прыгоды, таямнічае каралеўства Сварга. Ды толькі гэтым разам неспакойна ў іх сяброў, каралевічаў Рэглы і Сэнмура, чые землі прагне захапіць і замарозіць магутная вядзьмарка Маразанна. Ёй падуладная стыхія ветру і верна служаць чараўнік Падвей і паветрыкі. Каб даць рады гэтай зграі, Янку з Міланай належыць адгадаць шмат загадак, адшукаць таемны пакой і магічны кій, выявіць незвычайную кемлівасць і аб'яднаць тры каралеўствы. Дапамогуць ім у барацьбе Цмок, браты-волаты Вярнігара і Вярнідуб і нават загадкавыя феі, што, па паданнях, жывуць высока ў гарах. Юных герояў чакаюць новыя знаёмствы, неверагодныя прыгоды і слаўныя бітвы.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-632-5**

© Грушэцкі А. Л., 2023
© Козел В. І., ілюстрацыі, 2023
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2023

# Зімовая дарога



— Гэта наш апошні ўрок у гэтым паўгоддзі. Наперадзе вас чакаюць зімовыя вакацыі, Каляды, забавы і новыя прыгоды. Баўцеся добра, бо пасля адпачынку чакаю вас усіх з сачыненнямі на тэму: «Як я правёў калядныя святы». Напэўна, некаторыя з вас паедуць хто за горад, а можа хто і наогул у іншыя краіны. Так, Мілана? – звярнулася настаўніца да вучаніцы, якая ўжо аддалася марам, разважаючы, куды ж яна адправіцца. – Вось вы, куды плануеце паехаць?

– У каралеўства Сварга, – недзе летуценячы задуменна адказала дзяўчына.

– Куды? – жанчына ажно разгубілася.

– Га? Не, у вёску, да бабулі і дзядулі, – вярнулася з нябёсаў на зямлю Мілана.

– Гэта ўжо больш зразумела, таксама люблю бываць на вёсцы. Але ж што гэта за каралеўства?

– Гэта так, з фільма аднаго, фэнтэзі, – выкруцілася кемлівая школьніца.

– А я ўжо на секунду падумала, што нешта з геаграфіі прапусціла, – пажартавала настаўніца. – Зрэшты, зараз столькі экзатычных напрамкаў, што часам нават дзіву даешся.

Ужо дома дзяўчына прызналася брату:

– Ты ведаеш, я сёння знянацку ледзь не прабалбаталася пра каралеўства.

– Як так?

– Замарылася, быццам зноў па ім вандрую.

– Разумею, таксама сумую па тых прыгодах. Але ты, глядзі, асцярожней у наступны раз. Гэта вялікі сакрэт!

Яны насамрэч знудзіліся па тых часах, калі яны, як сапраўдныя героі, змагаліся за волю цэлага краю, ратавалі сваіх сяброў і адстойвалі справядлівасць. Успаміны адразу паглынулі іх, і ім зноў захацелася апынуцца побач са сваімі прыяцелямі, якія так хутка для іх сталі блізкімі і дарагімі: мудры Пугач, волат Вярнігара, вужалкі… А як жа там Цмок пажывае? Улічваючы, што час у залюстрэччы цячэ зусім інакш, пэўна, ён ужо падрос. А каралевічы Сэнмур і Рэгла, з якімі склаліся такія цёплыя адносіны? Спаткацца б з імі ізноў… А зрэшты – чаму не? Бацькі ім ужо паабяцалі, што вакацыі яны правядуць у бабулі з дзядулем. А значыцца – усё магчыма. І настрой адразу ж узняўся.

Ужо хутка яны радасна збіраліся ў дарогу. Але што з сабой узяць на гэты раз? Калі шчыра, браць даспехі Янку ўжо не так хацелася. За паўгода ён падрос, стаў больш сур’ёзны, і цягнуць з сабой у вёску штучны набор, ды яшчэ і зімой, яму ўжо было не цікава. Затое ў яго цяпер было тое крэсіва, пра якое ён так марыў. Бацька, даведаўшыся пра гэта, купіў яму, бо Янка нярэдка хадзіў у вандроўкі на прыроду са скаўтамі. І ліхтарык яшчэ паклаў у заплечнік, якасны, святлодыёдны. А таксама, хоць і кампактны, але досыць моцны палявы бінокль. І, вядома ж, не забыў ён запакаваць і акуратна ўкласці драўляныя крыж з падковай, пры дапа-

мозе якіх можна было адчыніць чароўны партал праз люстэрка ў таямнічае каралеўства.

А вось Мілана і ў гэты раз з задавальненнем брала сваю дыядэму, якой вельмі ганарылася. Вельмі цешыла дзяўчыну тое, за што яе атрымала – найпрыгажэйшая паміж аднагодкаў на раённым конкурсе! А на шыю павесіла той загадкавы кулончык дзіўнага фіялетавага колеру ў дэкаратыўнай аправе, пры дапамозе якога можна было выклікаць Цмока.

На наступны дзень яны ўжо і выехалі, каб паспець акурат да каляднай вячэры. Шлях быў няблізкі. Але менавіта зімой наш лес выглядае асабліва цудоўна, нават – чароўна. Высачэзныя сосны і яліны, нібы заможныя шляхцюкі і паненкі, апранутыя ў багатыя пясцовыя шапкі ды палярыны, выхваляюцца хараством сваіх строяў, якія так і ззяюць на сонцы. А рассыпаны пад ім сумётамі белы пушысты снег зіхаціць пералівам, нібы раскіданыя прыгаршчамі дарагія дыяменты. Гледзячы на гэтае пышнае багацце, Мілана з цеплынёй ўспомніла тую самую футраваю палярыну ад Сэнмура, годную асоб каралеўскай крыві. Вось бы калі яна спатрэбілася. Але ў такой раскошы фарсіць па вёсцы неяк няёмка. Хіба што пры двары. І тут перад яе вачыма паўстала выява прыгожа ўбранага замка, у якім яны балявалі перад развітаннем, і ў якім нарэшце ўладарыў праўдзівы кароль. Калі ўсё складзецца добра, то найверагодней з ім можа і пабачацца. Спадзяемся, у каралеўстве нарэшце пануе мір і спакой.

Казачны пейзаж за акном зачароўваў, але белая аднастайнасць хараства паволі закалыхвала, і неўзабаве дзеці і самі не заўважылі, як праваліліся ў сон. Раптам іх абудзіла рэзкае тармажэнне. Машына не пайшла ў

# Вяртанне ў каралеўства



Па калядным шэсці ўсе дзеці атрымалі ласункі. Асабліва прысмакаў дасталася «козачцы», якая больш за ўсіх працавала. А з іншага здабытку збіраліся зрабіць агульны стол для ўсіх калядоўшчыкаў. Янка з Міланай ісці не планавалі, хоць дзеці там таксама будуць. Яны добра стаміліся і хацелі адпачынку. Ведаючы па мінулых гадах, святочнае застолле працягнецца хіба не да раніцы – гуляць на вёсцы ўмеюць. А вось бацькі пойдуць абавязкова, бо вельмі хацелі пабачыцца са сваякамі ды сябрамі. І ўсе абавязкова чакаюць іх бабулю, без якой вечарына нават не ўяўляецца, бо без яе спеваў і свята не свята. Народных песень яна ведае багата, а яе голасам можна заслухацца сябе на радасць. Ну, і куды ж без іх дзеда – галоўнага зорканошы. Толькі пераапрануцца варта было і зорку назад у камору прыбраць. Да наступнай Каляды.

– Бацька, я ўсё сам прыбяру, ты збірайся, – запрапанаваў сын дапамагчы, каб нікога не затрымліваць.

Стары не адразу, але пагадзіўся і даў яму ключы. Зрэшты, яго з жонкай чакалі іншыя калядоўшчыкі. Пазаносіць старыя важкія кажухі, вялікую зорку ды іншае, насамрэч, часу адымала. Каб хутчэй даць рады з усім, далучыліся да бацькі і Янка з Міланай, якой так-

сама трэба было пакласці на месца сваю маску і футра «казы».

Дзеці ўвайшлі ў невялічкае памяшканне, стаіўшы дыханне. Для іх гэта была не проста камора, а нешта загадкавае, таямнічы пакой. Хоць рэчы трэба было класці ў іншае месца, але, заходзячы, яны ўтаропіліся і не адводзілі вачэй ад старога грувасткага куфра і старадаўняга люстэрка, якое было фактычна сямейнай рэліквіяй. Усё было на сваіх месцах. Яны так заглядзеліся, што ледзьве не ўрэзаліся адзін у аднаго.

– Э-гэй! Прачніцеся! – вярнуў бацька сваіх зачараваных летуценнікаў у рэчаіснасць.

А потым паглядзеў на тую сцяну і прызнаўся:

– Шчыра кажучы, мяне таксама ў дзяцінстве заварожвала гэтае люстра. Нешта ў ім ёсць, гэта нават цяжка перадаць на словах. Кажуць, што старажытныя люстэркі хаваюць у сябе шмат таямніц. Падумаць толькі, колькі нашых продкаў стаяла перад ім, глядзелася ў яго са сваімі думкамі, разважаннямі. Ёсць у гэтым нешта загадкавае, можа нават містычнае. Калі ўглядаешся ў гэтую бясконцасць… Нездарма ж, напэўна, люстры лічаць парталамі ў іншыя вымярэнні.

– Напэўна, – пагадзіўся Янка. – А табе дзеда нічога пра яго не распавядаў?

– Не. Ды я неяк і сам не пытаў у яго. Прызнацца, колькі памятаю, яно заўсёды вісела ў каморы, а пускаць ён сюды нікога не любіць. Для яго гэта скарбніца, уласная тэрыторыя, дзе іншым знаходзіцца не пажадана. Амаль sancta sanctorum – святая святых, як кажуць на лаціне. Хаця, па мне, дык нічога тут настолькі каштоўнага нямашака. Хіба, у куфры можа нешта і хавае.

# Каралеўства Вагорыя



У хаце было цёпла і ўтульна. Цяпло ад печы разлівалася па ўсім памяшканні, і, успамінаючы ўчарашнюю непагадзь, нават не хацелася вылазіць з-пад коўдры – груба апрацаванай скуры, якімі ім далі накрыцца і пад якімі так смачна спалася. Але гаспадыня ўжо ва ўсю грымела чыгункамі і слаўся такі духмяны водар, што хочаш не хочаш, прачнешся. Ды і шлях далейшы на іх чакаў.

– Вого! Калі ж гэта вы паспелі?! – здзіўлена прамовіў Янка, пабачыўшы ўжо амаль накрыты стол.

– У нас як певень устаў, то і мы з ім. Хочаш мець гаспадарку – працаваць трэба зранку.

– Маеце рацыю, гаспадыня. Бадай, і нам няма чаго час губляць.

– Э, не, – не пагадзілася жанчына. – А вось вам пасля такой дарогі трохі адпачыць не зашкодзіць, – усміхнулася яна. – Я толькі нас мела на ўвазе. Вялікая гаспадарка патрабуе і вялікай адказнасці.

А гаспадарка ў іх і насамрэч была годная. Гэта госці ацанілі нават у поцемках. І хата была не маленькая, ды і двор за плотам прасціраўся на вялікай плошчы – і сад, і гарод, багата пабудоў. Трымаць усё у парадку, пэўна ж, адымала добра сіл і часу. Жыццё на зямлі, гэта не ў го-

радзе, дзе ўсё пад рукой. Тут усё трэба даглядаць, гадаваць. Але, калі ты працавіты і глядзіш за ўсім адказна, не лянуешся, то і зямля прыносіць табе плён, адпаведны намаганням.

Гаспадыня дастала з печы патэльню і паклікала дзяцей за стол. Там ужо чакала бульбачка ў чыгунку, свежая сакавітая гародніна, хрумсткая зяляніна ды запраўкі, а на самой патэльні яшчэ скварылася і пырскала, пастрэльваючы, толькі прыгатаваная гарачая яечня са скваркамі. Ад такой стравы не адмовішся.

– Як жа неверагодна пахне! – ледзь стрымліваўся хлопец.

Жанчына ўсміхнулася і пачала раскладаць ежу па місках. Госці накінуліся, нават не чакаючы, пакуль астыне.

– Ну як? – пацікавілася гаспадыня.

– Смачна неверагодна, – прагна жуючы пахваліў Янка.

– Так, папросту пышна, – падтрымала сястра, цягнучыся за зялянінай.

– Вось і добра. Ежце, мае харошыя. Шлях да замка далёкі, падмацуйцеся перад дарогай, як след.

Нават гарцукі толькі і закідвалі лыжку за лыжкай. Але гаспадыні гэта дастаўляла толькі радасць, што яе гатаванні так прыйшліся ўсім даспадобы. Па сытым стале госці аддзякавалі за ўсё, ды пакрысе пачалі збірацца ў шлях. А жанчына тым часам склала ім клуначак яшчэ і з сабой.

На вуліцы было свежа і зябка. Але гэта ранішняя прахалода нават бадзёрыла. Калі што трохі і псавала настрой, дык тое, што пасля праліўнога дажджу вакол было страшна гразка, а дарога стала зусім размытай.



***Алег Грушэцкі***

*Беларускі пісьменнік, журналіст. Бацька траіх дзяцей.*

*У мінулым – адзін з арганізатараў скаўцкага руху ў Беларусі. Удзельнік першага беларускамоўнага летніка «Грунвальд».*

*Дэбютаваў у 1994 годзе ў часопісе «Першацвет». Аўтар вершаў, казак і фэнтэзі для дзяцей і падлеткаў. Кніга А. Грушэцкага «Краіна Вымярэнія» (2019) два гады запар уваходзіла ў ТОП найлепшых беларускіх кніг для дзяцей. Выйшлі кнігі «Рыцар Янка і каралеўна Мілана. Таямнічае каралеўства» (2021), «Рыцар Янка і каралеўна Мілана. Каралеўству патрэбны героі» (2022) з ілюстрацыямі В. Козела. Аўтар літаратуразнаўчых і гістарычных артыкулаў як у беларускіх, так і ў замежных навуковых выданнях. Перакладае з польскай мовы на беларускую.*

*Лаўрэат шэрага творчых прэмій. Увайшоў у лонг-ліст IV Міжнароднага літаратурнага фестывалю-конкурсу «Рускі Гофман» у намінацыі «Проза казачная, фантазійная» (2019).*

ЗМЕСТ


Зімовая дарога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Калядоўшчыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Вяртанне ў каралеўства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Змрочная і халодная гісторыя . . . . . . . . . . . . . . 36
Прыём . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Крумкач – новы вучань Пугача . . . . . . . . . . . . . . 67
Змяіны кароль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Халадае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Дарога праз могілкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Каралеўства Вагорыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Палёт на Цмоку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Загадкавыя вілы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
Таемны пакой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Таямніцы дыпламатыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
Начны напад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 214
Перамовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
Полымя растопіць лёд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247

*Пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 270